Converted by Total Image Converter - (no stamps are applied by registered version)

**ГЕНЕРАЛЬНАЯ ПРАКУРАТУРА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Інтэрнацыянальная, 22, 220030, г. Мінск
тэл. (+375 17) 226 43 57, 328 55 41
факс (+375 17) 226 42 52
E-mail: info@prokuratura.gov.by
www.prokuratura.gov.by

**ГЕНЕРАЛЬНАЯ ПРОКУРАТУРА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Интернациональная, 22, 220030, г. Минск
тел. (+375 17) 226 43 57, 328 55 41
факс (+375 17) 226 42 52
E-mail: info@prokuratura.gov.by
www.prokuratura.gov.by

19.09.2013 № 0703-446-2012

На № ____________ от ______________

Шапуцька Г.В.

вул.Пляханава, д.95, кв.134
г.Мінск

Генеральнай пракуратурай разгледжаны Ваш зварот аб нязгодзе з пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 12.05.2004 № 15, якой зацверджана зона аховы нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій 30-40 гадоў XX стагоддзя ва ўрочышчы Курапаты».

Дадзеная пастанова з'яўляецца нарматыўна-прававым актам і 25.05.2012 уключана ў Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь.

Згодна з п.1 пастановы прыкладзеная схема зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці «Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій 30 - 40 гадоў XX стагоддзя ва ўрочышчы Курапаты» зацверджана на перыяд да распрацоўкі горадабудаўнічага праекта стадыі дэтальны план. Па заказу Мінскага райвыканкама УП «Мінскграда» распрацоўваецца праект дэтальнага плана дадзенай тэррыторыі, які будзе ўключаць праект зон аховы названай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Распрацаваны УП "Праектрэстаўрацыя" па заказу грамадскага аб'яднання "Беларуская асацыяцыя ахвяр палітычных рэпрэсій" праект зоны аховы гэтай гісторыка-культурнай каштоўнасці быў адобраны 20.05.2003 на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры з заўвагамі, але не быў зацверджаны Міністэрствам культуры.

У адпаведнасці з п.2 пратакола пасяджэння Рады было вырашана лічыць неабходным прапрацоўку накірункаў асваення прылеглых да каштоўнасці тэрыторый з улікам Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23.04.2003 №165 "Аб зацвярджэнні генеральнага плана г.Мінска з прылеглымі тэрыторыямі і некаторых пытаннях яго рэалізацыі", звярнуўшы асаблівую ўвагу на падрыхтоўку рэгламентаў выкарыстання асобных участкаў. Аднак перапрацаваны праект не быў накіраваны ў Міністэрства культуры для ўзгаднення.

Такім чынам, пастанова Міністэрства культуры ад 12.05.2004 № 15 з'яўляецца законнай.

Converted by Total Image Converter - (no stamps are applied by registered version)

Дадзенае рашэнне вы маеце права абскардзіць кіраўніцтву Генеральный пракуратуры.

Намеснік начальніка аддзела
па нагляду за выкананнем
прыродаахоўнага і зямельнага
заканадаўства

Д.Р. Васілевіч